*Навіны кнігавыдання*




Пабачыла свет кніга члена СПБ Браніслава Ермашкевіча “ВОДСВЕТ ДАЛЁКІХ ДЗЁН”. Кніга прысвячаецца 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і апавядае пра Герояў Савецкага Саюза і іншых ваеннаслужачых, якія прымалі ўдзел у абароне і вызваленні горада Гродна, пра партызанаў і падпольшчыкаў Гродзеншчыны, імёнамі якіх названы вуліцы горада, пра ветэранаў, імёны якіх занесены ў Кнігу Славы Гродзенскай вобласці, Кнігу Славы горада Гродна, пра Ганаровых грамадзян горада. Кніга ўтрымлівае вершы аўтара, нарысы, шматлікія дакументальныя і ілюстрацыйныя матэрыялы.

Аўтар спадзяецца, што выданне будзе карысным для шырокага кола грамадзкасці, прынясе плён у высакароднай справе захавання гістарычнай памяці народа, выхавання моладзі на пазіцыях

нацыянальна-гістарычнай самасвядомасці і пераемнасці пакаленняў.

**Прэс-служба СПБ-Гродна**